ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1981
1 КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 27 (1327)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт"
## тэлетайп
· Учора · Сёння · Заўтра ·

### ДЗЕНЬ ПРАПАГАНДЫСТА

прайшоў у Белдзяржуніверсітэце. З дакладам «У адзінстве з народам — сіла партыі, у адзінстве з партыяй, у яе кіраўніцтве — сіла народа» выступіла загадчыца кафедры гісторыі КПСС ІПК А. М. Русакова.

За актыўную прапаганду палітычных ведаў і плённую работу па камуністычнаму выхаванню працоўных Ганаровай граматай рэктарата, парткома і мясцкома ўзнагароджаны лепшыя універсітэцкія прапагандысты: А. М. Ельяшэвіч, прафесар кафедры ядзернай фізікі, акадэмік АН БССР; А. І. Ляўко, дацэнт кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў; І. П. Кахно, в. а. загадчыка кафедры рускай савецкай літаратуры; А. М. Русакова, загадчыца кафедры гісторыі КПСС ІПК; С. С. Шушкевіч, прафесар, загадчык кафедры ядзернай фізікі.

І. РАМАНОЎСКІ,
загадчык сектара палітасветы парткома.

### УСЕСАЮЗНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

па працэсах узмацнення ў фатаграфічных сістэмах рэгістрацыі інфармацыі, арганізаваная навуковым саветам па праблеме «Фатаграфічныя працэсы рэгістрацыі інфармацыі», НДІ ФХП і БДУ, адбылася 28—30 верасня. На пасяджэннях абмеркаваны, сярод многіх пытанняў, праблема бясшумнага ўзмацнення ў фатаграфіі, выкарыстанне рэакцыі хімічнага асаджэння металаў у працэсах фатаграфічнага праяўлення і іншыя.

У час работы канферэнцыі была наладжана дэманстрацыя дакладаў на стэндах.

С. ІВАНОВА.

### ПЫТАННІ

аб праверцы выкарыстання электраэнергіі ў вучэбных і вытворчых карпусах універсітэта, аб гатоўнасці сталовых і буфетаў, якія абслугоўваюць студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ, да пачатку навучальнага года, а таксама вынікі рэйду-праверкі наяўнасці і спраўнасці пішучых машынак на факультэце журналістыкі былі заслуханы і абмеркаваны на чарговым пасяджэнні універсітэцкага камітэта народнага кантролю.

З інфармацыяй аб мерапрыемствах па падрыхтоўцы да новага навучальнага года ў школах народных кантралёраў БДУ выступіла старшыня КНК А. С. Каспяровіч.

Т. САХАШЧЫК.

ФОТАРЭПАРТАЖ

## ПЕРШЫ ЎРОК

ЗАКОНЧЫЛАСЯ студэнцкае лета са сваімі цікавымі справамі, працай у будаўнічых атрадах, паходамі па месцах баявой і працоўнай славы старэйшых пакаленняў. І вось зноў навучальны год. Для студэнтаў пятага курса фізфака педагагічнага патоку універсітэта гэты навучальны год асаблівы. З верасня 220 студэнтаў упершыню праходзяць практыку ў школах горада Мінска.

Першы ўрок заўсёды хвалюючы. Хвалюючы таму, што ты ўпершыню ўваходзіш у клас ужо не ў якасці вучня, а ў якасці настаўніка, і павінен данесці вучням усё, што патрабуе праграма, правесці ўрок на высокім узроўні. А каб быць на вышыні, трэба як след падрыхтавацца да заняткаў, скласці планы-канспекты, падрыхтаваць наглядныя дапаможнікі. Самы строгі экзаменатар — вучнёўская аўдыторыя. Школьнікі рэагуюць на ўсё: як ты падрыхтаваўся да заняткаў, якімі ведамі валодаеш.

Мы пабывалі на занятках, якія праводзілі практыканты ў 41-й школе г. Мінска.



Урок вядзе студэнтка 5-га курса фізічнага факультэта Зінаіда Сімановіч. Яна падрыхтавала да заняткаў наглядныя дапаможнікі, прынесла прыборы, якія спатрэбяцца для пастаноўкі доследаў па новай тэме, яшчэ раз зазірнула ў канспект. А канспект у яе напісаны сапраўды грунтоўна. Там можна знайсці тэму і мэту урокаў, падрабязнае апісанне доследаў, якія будзе неабходна правесці на занятках і г. д.

Празвінеў званок, вучні селі на свае месцы. Аднакурснікі Зіны занялі апошнія парты, бо яны таксама будуць ацэньваць гэты ўрок, аналізаваць яе ўдачы і памылкі.

Урок Сімановіч пачынае з апытвання. Яна выклікае некалькі вучняў да дошкі, дае ім індывідуальныя заданні. Пакуль яны рыхтуюцца да адказаў, Зіна працуе з класам: задае пытанні па пройдзенай тэме, слухае тлумачэнні школьнікаў. Робіць гэта студэнтка так, каб кожны вучань быў ахоплены работай. Увесь час прымушае думаць не толькі таго, хто адказвае на пытанне, а і ўсіх вучняў класа.

Потым усе правяраюць заданні, выкананыя на дошцы. За адказы Сімановіч выстаўляе ацэнкі і прыступае да тлумачэння новай тэмы. А каб новы матэрыял лепш засвойваўся вучнямі, звязвае яго са з'явамі прыроды. Зіна не толькі стараецца даходліва тлумачыць, але і прымушае клас працаваць самастойна, задае пытанні па тэме, слухае адказы.

Урок закончаны. Школьнікі выходзяць на перапынак, а практыкантка разам з настаўніцай, выкладчыцай фізікі М. А. Камянецкай і сваімі таварышамі застаецца ў лабараторыі разбіраць ход заняткаў.

А ў цэлым М. А. Камянецкая і студэнты ацанілі ўрок, праведзены Зінаідай Сімановіч, на «выдатна».

У. ПРАЧУХАНАЎ,
В. МАСКАЛЁЎ.



**На здымках:** урок фізікі вядзе Зінаіда **Сімановіч**; настаўніца метадыст **М. А. Камянецкая** тлумачыць студэнтам-практыкантам як лепш правесці доследы па тэме.

Фота **аўтараў**.

**ВАЛЯНЦІНА ГЕОРГІЕЎНА МАРКАВА за дасягнутыя поспехі ў выкананні заданняў дзесятай пяцігодкі па падрыхтоўцы спецыялістаў для народнай гаспадаркі ўзнагароджана медалём «За працоўную адзнаку».**

РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ

## ГАЛОЎНЫ БУХГАЛТАР

ДАРЭМНА шукаць прозвішча В. Г. Маркавай у спісах прафесарска - выкладчыцкага саставу. Да вучэбнага працэсу яна, здавалася б, мае ўскоснае дачыненне. Аднак нельга нават уявіць жыццё універсітэта без яе работы і работы калектыву, які яна ўзначальвае. І тое, што для нас выступае як сухія калонкі лічбаў, як дэбет і крэдыт, для яе, перш за ўсё, работа.

Пагутарыць з Валянцінай Георгіеўнай у яе кабінеце не вельмі проста. Галоўнаму бухгалтару цяжка знайсці вольную хвіліну. Такая ўжо ў яе пасада. І лягчэйшай яна не жадае (аб гэтым я даведаўся пазней). Таму, каб задаць некалькі пытанняў, прыйшлося добрае паўгадзіны чакаць у чарзе.

«Шчаслівы чалавек. Любіць сваю справу»,— гавораць пра яе адны.

— Ці так?— пытаюся.

— Гэта вялікае шчасце — знайсці сваё месца ў жыцці,— адказвае Валянціна Георгіеўна.— На любой пасадзе поспех прыходзіць не сам па сабе, не адразу лёгка ўсё атрымліваецца. Але, калі раз і назаўжды рашыў кім быць і дзе быць, калі крок за крокам ідзеш да сваёй мэты, тады жаданае абавязкова збудзецца. Гэта неабходна памятаць усім, асабліва моладзі.

«Прынцыповы, адукаваны кіраўнік»,— дадаюць другія.

Калектыў—механізм складаны, бо гэта, перш за ўсё, людзі, з якімі кожны дзень сустракаешся, робіш адну справу. І калі паміж імі няма ўзаемаразумення, калі кожны хвалюецца толькі за сябе, за свой участак работы, і не дбае пра іншых, тады механізм гэты пачынае працаваць з перабоямі. Тут многае залежыць ад кіраўніка, ад яго прафесійных здольнасцей, ад умення працаваць з людзьмі. Ён — нібы магніт, што прыцягвае людзей, аб'ядноўвае іх.

Калектыў бухгалтэрыі (а ён не малы — 34 чалавекі) паспяхова спраўляецца са сваімі абавязкамі. Пасада фінансавага работніка патрабуе высокіх маральных якасцей, даверу, зладжанасці, адказнасці за агульную справу. За ўвесь час, на працягу якога Валянціна Георгіеўна з'яўляецца галоўным бухгалтарам універсітэта, не было выяўлена грубага парушэння фінансавай дысцыпліны, злоўжывання дзяржаўнымі сродкамі. Адзін з «маленькіх сакрэтаў» поспеху — добра наладжаная выхаваўчая работа, атмасфера павагі, шчырасці, што пануе ў бухгалтэрыі.

— У кожнага работніка бухгалтэрыі свая сям'я, свае клопаты, мары. Аднак мы заўсёды знаходзім час пагутарыць, павіншаваць адна адну з днём нараджэння ці іншай знамянальнай падзеяй. Такія вось пазаслужбовыя адносіны зближаюць людзей.

— А мяне ўзнагарода радуе, натхняе, абавязвае працаваць яшчэ больш і лепш,— гаворыць на развітанне В. Г. Маркава.

А. ЛАЗОЎСКІ,
наш кар.

# РЭХА ПРАЦОЎНАГА

**АГУЛЬНАЯ КОЛЬКАСЦЬ БАЙЦОЎ — 377**
**ВЫКАНАНА РАБОТ НА СУМУ 1 МЛН. 189 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ**
**САБРАНА ПЛАДОВА-ГАРОДНІННАЙ ПРАДУКЦЫІ — 4020 ТОН**
**ДАДЗЕНА КАНЦЭРТАЎ — 57**
**ПРАЧЫТАНА ЛЕКЦЫЙ — 54**
**ПАБУДАВАНА СПАРТЫЎНЫХ ПЛЯЦОВАК — 14**

# СТАРОНКІ МАЛДАЎСКАГА ЛЕТА

### СТАРОНКА ПЕРШАЯ. ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ

Слабадзейскі занальны студэнцкі атрад — гэта 123 лінейныя атрады, звыш шасці тысяч байцоў. Месца дысланацыі — Слабадзейскі раён Малдаўскай ССР. У складзе занальнага атрада — студэнты з Беларусі, Малдавіі, Арлоўскай вобласці РСФСР. Сярод іх — сем СБА Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. У параўнанні з 1980 годам, калі на палях Малдавіі працавалі 18 універсітэцкіх атрадаў, гэта зусім нямнога. Здарылася так, што неаднаразовы пераможца сацыялістычнага спаборніцтва СБА «Расінка» адправіўся гэтым летам у Якуцію на будаўніцтва аб'ектаў Байкала-Амурскай магістралі, шэсць атрадаў выехалі ўпершыню ў Стаўрапольскі край, значна расшырылася прадстаўніцтва нашых атрадаў у Віцебскай вобласці. Каму ж давялося прадстаўляць БДУ на малдаўскай зямлі ў працоўным семестры 1981 года?

Гэта студэнцкія атрады «Пунсовыя ветразі» факультэта прыкладной матэматыкі і «Алеся» хімічнага факультэта (калгас імя Карла Маркса), «Мара» філалагічнага і «Гадограф» механіка-матэматычнага факультэтаў (калгас імя Жданава), «Сузор'е» факультэта прыкладной матэматыкі і імя Прытыцкага гістарычнага фадультэта (калгас імя У. І. Леніна) і, нарэшце, СБА імя Ф. Шменкеля філалагічнага факультэта (калгас «XX партз'езд»). Іх штодзённай работай кіравалі Аня Валанцэвіч — выпускніца механіка-матэматычнага факультэта (калгас імя Жданава), Наталля Лунёва —аспірантка факультэта прыкладной матэматыкі (калгас імя У. І. Леніна), Марыя Пуроўская — выпускніца філалагічнага факультэта (калгас «XX партз'езд»).

З прадстаўнікоў універсітэта быў сфарміраваны і занальны штаб, якому давялося каардынаваць і накіроўваць работу усіх 123 лінейных атрадаў, якія дыслацыраваліся ў раёне.

### СТАРОНКА ДРУГАЯ. НОРМА: ВЫШЭЙ НОРМЫ!

Стала ўжо добрай традыцыяй, што студэнты Белдзяржуніверсітэта штогод з'яўляюцца лідэрамі раённага сацыялістычнага спаборніцтва сярод СБА Слабадзейшчыны. Увайшлі ў гісторыю, сталі самой гісторыяй такія атрады, як «Расінка» і «Стэлуца» механіка-матэматычнага, «Купалінка» хімічнага факультэтаў. Іх не было сёлета ў Малдавіі. Хто ж можа падхапіць, падтрымаць іх прыклад? І лідэры знайшліся. Уперад упэўнена выйшаў СБА «Пунсовыя ветразі» факультэта прыкладной матэматыкі. Трэці год працуе гэты атрад у Малдавіі, другі год запар — у калгасе імя К. Маркса. За гэты час назапашаны традыцыі, набыты вопыт, умацаваны касцяк атрада. Дзелавыя адносіны склаліся з кіраўніцтвам гаспадаркі — старшынёй калгаса У. Л. Калашнікавым і сакратаром партыйнай арганізацыі І. Д. Чэканам.

Сёлетні год быў цяжкім для работнікаў сельскай гаспадаркі Малдавіі. Зацяжная, халодная вясна, затым працяглая засуха не дазволілі гароднінным раслінам набраць неабходную моц, раскусціцца, прынесці паўнаважкія плады. Таму ураджай аказаўся ніжэйшы, чым у папярэднія гады. У гэтай сітуацыі асабліва важна было убраць усё, што вырашчана. Разумеючы гэта, байцы «Пунсовых ветразей» прыклалі ўсе намаганні, каб унесці максімальны ўклад у забеспячэнне насельніцтва краіны свежымі фруктамі і гароднінай. Для іх стала нормай штодзённае перавыкананне планавых заданняў. За працоўны семестр байцамі гэтага СБА сабрана 788 тон пладова-гароднінная прадукцыі.

Успамінаецца такі эпізод. Прыехаўшы ў брыгаду № 3 калгаса імя К. Маркса (а іменна тут размяшчаліся студэнцкія атрады «Пунсовыя ветразі» і «Алеся» БДУ імя У. І. Леніна і «Беларусь» Мінскага інстытута культуры) у гадзін адзінаццаць вечара, быў здзіўлены незвычайным для такога позняга часу ажыўленнем на тэрыторыі лагера. Аказваецца, толькі-толькі закончылі нагружаць апошнія машыны з памідорамі. «Нельга ж, каб машыны да раніцы прастойвалі пад пагрузкай, — гаворыць камандзір «Пунсовых ветразей» Аня Скамарох.— За гэты час нашы памідоры паў-дарогі да Беларусі пройдуць». Дарэчы, Аня Скамарох ужо другі год выязджае камандзірам СБА. У поспехах атрада вялікая частка яе заслуг. Надзейны і камісар — Людміла Лапцёнак. Калі ў сярэдзіне сёлетняга лета ўзнікла неабходнасць на тыдзень замяніць камандзіра (у жыцці Ані адбылася знамянальная падзея — яна выходзіла замуж), Людміла здолела зрабіць гэта так, што рабочы рытм атрада не збіўся. Узнагародай за самаадданую працу для байцоў атрада «Пунсовыя ветразі» стала другое месца ў раённым сацыялістычным спаборніцтве сярод лінейных атрадаў.

Нароўні з прадстаўнікамі факультэта прыкладной матэматыкі працавалі і студэнты-хімікі. СБА «Алеся» гэтага факультэта (камандзір Валянціна Шаўцова, камісар Вольга Післякова) зусім нямнога ўступалі лідэрам. Вось бы яшчэ якасны састаў атрада крыху лепш падабраць. Але гэта ўжо задача на новы працоўны семестр. А падводзячы вынікі сёлетняга, неабходна адзначыць, што ўклад у датэрміновае выкананне калгасам імя К. Маркса плана па адгрузцы гародніны ў агульнасаюзны фонд, СБА універсітэта ўнеслі важкі.

Нядрэнна папрацавалі ў працоўным семестры-81 і астатнія універсітэцкія атрады. Аднак усё ж ад лідэраў іх аддзяляе значная дыстанцыя. Гэта звязана, між іншым, у значнай ступені і з гаспадаркай, дзе прыходзіцца працаваць. Нельга параўнаць, напрыклад, калгас імя Жданава ці «XX партз'езд» з калгасам імя Свярдлова, дзе і агратэхнічны ўзровень вышэй, і арганізацыя працы лепшая, і ураджайнасць вышэйшая. Але усё ж лідэры ёсць лідэры, на іх трэба раўняцца, пераймаць іх вопыт, старацца пайсці далей. Толькі так можна дасягнуць поспеху.

### СТАРОНКА ТРЭЦЯЯ. «И НАШЕ ВРЕМЯ НА ЦИФЕРБЛАТАХ...»

Калі вы звярталі ўвагу на рознакаляровыя этыкеткі на скрынках з памідорамі, то змаглі, магчыма, прыкмеціць, што акрамя абавязковай інфармацыі там часта прысутнічае і назва атрада, які сабраў гэтыя чырвонабокія малдаўскія падарункі. Малдаўскія атрады маюць немалыя традыцыі і вельмі беражліва адносяцца да іх захавання. Адна з такіх традыцый — нязменнасць назвы атрада. Вось ужо колькі гадоў праходзіць, а ў дыслакацыі — адны і тыя ж назвы. І не трэба нават думаць і гадаць, таму, што адразу вядома, што «Гадограф» — гэта будучыя матэматыкі, імя Прытыцкага — прадстаўнікі гістарычнага факультэта, а «Мара»... Ну, хто ва універсітэце можа марыць так лёгка і шырока, як філфакаўцы! Увайшоўшы ў іх жылыя памяшканні, бачыш першае, што кідаецца ў вочы — гіганцкіх памераў насценная газета. Яны назвалі яе «Летуценнікі», у тон назве атрада. Нездарма газеты «Мары» былі прызнаны лепшымі на злёце СБА універсітэта, на фестывалі студэнцкіх атрадаў Слабадзейскага раёна. Умеюць філолагі трымаць марку роднага факультэта. Але не толькі ў друку праявілі сябе «мараўцы» ў працоўным семестры-81. Надоўга запомняцца жыхарам Уладзіміраўкі, Канстанцінаўкі, Нікольскага, Суклеі канцэрты мастацкай самадзейнасці, выступленні атраднай агітбрыгады. А заключны вялікі канцэрт у раённым Палацы культуры для жыхароў усяго раёна! Ён быў амаль на трэць падрыхтаваны будучымі філолагамі. У гэтым годзе СБА «Мара» быў інтэрнацыянальным. У яго складзе працавалі 18 студэнтаў-стажораў з ГДР. І як прыемна было камісару атрада Таццяне Ганчаровай атрымліваць пасля іх ад'езду на Радзіму лісты са словамі шчырай падзякі за праведзеныя ў атрадзе дні.

У адным калгасе з «Марай» вось ужо чацвёртае лета запар працуе «Гадограф». Дзяўчаты з механіка-матэматычнага факультэта гэтым летам выйшлі пераможцамі агляду-конкурсу на лепшую пастаноўку работы па ахове працы. Самая нізкая колькасць рабочых дзён, страчаных з-за непрацаздольнасці,— дасягненне значнае. У саставе «Гадографа» працавалі трое падлеткаў, якія стаяць на ўліку ў камісіях па справах непаўналетніх. Сярожа Шклярык? Саша Ляшчынскі? Ды якія ж яны «цяжкія»? Яны проста — падлеткі. А ў рабоце любому фору могуць задаць. Працоўнае лета, праведзенае ў саставе атрада, стане пачаткам працоўнага і чалавечага станаўлення іх характараў.

А байцам СБА «Сузор'е» і імя Прытыцкага, якія працавалі ў калгасе імя Леніна сяла Копанка, асабліва запомніцца, вядома, мітынг каля абеліска салдацкай славы на Кіцканскім плацдарме, на месцы крывапралітных баёў у ходзе Яса-Кішынёўскай аперацыі. Усім сэрцам сутыкнуўшыся з подзвігам, адчуўшы на сабе подых тых суровых гадоў, студэнты яшчэ больш яскрава ацанілі самаадданасць і гераізм тых, хто не вярнуўся з палёў вайны.

### СТАРОНКА ЧАЦВЁРТАЯ. ФЕСТЫВАЛЬ...

Буйнейшым па маштабах грамадска-палітычным мерапрыемствам у рамках занальнага атрада стаў фестываль студэнцкіх атрадаў і моладзі Слабадзейскага раёна «Вара-81».

...2 жніўня. Святочна ўпрыгожаны стадыён райцэнтра Слабадзея. Гучыць музыка, палымнеюць сцягі. Стройныя калоны зводных атрадаў выстрайваюцца на футбольным полі. Настрой ва ўсіх прыўзняты — палова спраў ужо зроблена, наступіў «пік» трэцяга працоўнага. Камандзіры атрадаў рапартуюць аб сваіх дасягненнях за першы месяц работы. Пачэснае права ўнесці і падняць сцяг фестывалю прадастаўлена лепшым з лепшых. Сярод іх баец СБА імя Ф. Шменкеля, кавалер медаля «За працоўную доблесць» Люба Буцалева. І вось блакітнае палотнішча фестывальнага сцяга ўзмывае ў такое ж блакітнае жнівеньскае неба. Фестываль адкрыты...

Ад імя ўсіх байцоў СБА раёна камісар атрада імя Прытыцкага Наташа Сакалова перадае рапарт сакратару раённага камітэта партыі Ф. Я. Ніpану. Усіх удзельнікаў і гасцей фестывалю вітаюць першы сакратар РК ЛКСММ В. Г. Апосталава, камандзір Малдаўскага рэспубліканскага штаба СБА Р. І. Тарноўскі.

Праграма фестывалю «Вара-81» была надзвычай разнастайнай і ўключала ў сабе конкурсы агітбрыгад, палітычнай песні, палітычнага плаката, насценнага друку, санбюлетэней, шматлікія спартыўныя спаборніцтвы. Упершыню былі праведзены конкурс прафесійнага майстэрства, медыцынская эстафета, гумарыстычная эстафета «Ну, пачакай!»

Найлепшым чынам зарэкамендавалі сябе на фестывалі байцы зводнага атрада калгаса імя Жданава. Мяркуйце самі: 1-е месца ў конкурсе агітбрыгад і ў конкурсе насценнага друку, 2-е месца ў конкурсе палітычнай песні і ў медыцынскай эстафеце. Дарэчы, вакальная група студэнтаў з ГДР з атрада «Мара» была адзначана за найбольш яскравае адлюстраванне ў сваіх песнях ідэй дружбы і салідарнасці з моладдзю краін, якія змагаюцца супраць дыктатарскіх рэжымаў, рэакцыі, фашызму. Актыўны ўдзел байцы СБА «Мара» прынялі і ў падрыхтоўцы тэатралізаванага закрыцця фестывалю. Апошнім, крыху сумным акордам гэтага свята юнацтва, сілы, характва прагучала песня:

*...Флаг опущен, закончилась*
*«Вара»,*
*Салютуем тебе, фестиваль!*
*Наш последний молдавский*
*подарок,*
*Уезжать, расставаться нам*
*жаль.*
*До свиданья, друзья,*
*До свиданья, Слободзея,*
*Будем долго беречь*
*Память наших коротких*
*встреч...*

Вось і ўсё. Працоўнае лета 1981 года стала адной са старонак гераічнага летапісу камсамола. Узведзены новыя гмахі жылых дамоў, пабудаваны школы, бальніцы, кіламетры дарог, сабраны дзесяткі тысяч тон гародніны. Байцы Слабадзейскага занальнага студэнцкага атрада імя В. З. Харужай вярнуліся ў студэнцкія аўдыторыі. Працоўнае лета зблізіла іх, загартавала духоўна і фізічна, дало новы запал бадзёрасці, аптымізму. Доўга будуць сніцца ім і бясконцыя радкі памідораў, і пякучае малдаўскае сонца, і дзявочы хор пад гітару, і шумнацечны Днестр, і хвалюючыя мінуты развітання з Малдавіяй на пероне Ціраспальскага вакзала. Экзамен на сталасць вытрыманы! Другі раз запар Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна прызнаны лепшым сярод навучальных устаноў Беларусі, якія фарміруюць атрады ў Малдавію. Да пабачэння, працоўны семестр-81!

**А. ШЫБУТ,**
**камандзір**
**Слабадзейскага занальнага**
**атрада імя В. З. Харужай.**



# НА ПРАЦОЎНЫМ МЕРЫДЫЯНЕ

ШКЛОЎСКІ раён займае вядучае месца сярод раёнаў нашай краіны па вырошчванню льну і аб'ёмам нарыхтовак ільнопрадуктаў. Вялікую дапамогу працаўнікам сяла аказваюць студэнты універсітэта. У гэтым годзе — 1500 юнакоў і дзяўчат з БДУ і Мінскага індустрыяльнага тэхнікума прыбылі ў Шклоў. Студэнты-другакурснікі геаграфічнага факультэта, аб'яднаныя ў сельгасатрад «Географ-81», былі накіраваны ў калгас імя К. Маркса.

Ужо ў першыя тыдні работы ў «баявых лістках», якія рэгулярна выпускала атрадная рэдкалегія, была адзначана паспяховая работа асобных камсамольцаў. Так, раней за іншых выканаўшы дзённую норму П. Анціпаў, В. Вайтовіч, А. Сушчэня, І. Пракаповіч, А. Цабій не пакідалі поля, а дапамагалі сябрам. Звыклыя да працы рукі студэнтак Г. Гуд і В. Чарнавец умела спраўляліся на калгаснай ферме: дзяўчаты даілі кароў, дапамагалі даглядаць за жывёлай. А. Сязончык і І. Шарай добра зарэкамендавалі сябе на сяўбе азімых.

Кожны вечар у рабят запоўнены цікавымі справамі: яны ўмеюць не толькі добра працаваць, але і адпачываць. Рыхтуецца выступленне агітбрыгады, выпускаецца насценгазета, праводзяцца сходы і палітінфармацыі. Наладжаны кантакт з камсамольскай арганізацыяй калгаса, сіламі студэнтаў быў падрыхтаваны — сумесны з СДК — канцэрт мастацкай самадзейнасці. Перад працаўнікамі вёскі выступалі факультэцкія майстры мастацкага слова, вакальныя групы, са сцэны гучалі народныя песні, гумарэскі. У канцы канцэрта па традыцыі быў выкананы гімн геафака, які з натхненнем спявалі не толькі студэнты, але і ўся зала.

**М. КУХАРЧЫК,**
**камандзір ССГА «Географ»,**
**М. БРЫЛЕЎСКІ,**
**камісар.**





**З раніцы да позняга вечара не змаўкае гул матораў на палях саўгаса «Чавускі» Чавускага раёна, дзе поўным ходам ідзе ўборка бульбы. Разам з камсамольцамі і моладдзю гаспадаркі ўдарна працуюць студэнцкія сельгасатрады Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.**

**НА ЗДЫМКАХ: бульбаўборачныя агрэгаты за работай; кветкі за выдатную работу дорыць камбайнер саўгаса студэнткам механіка-матэматычнага факультэта Ірыне Навотнай, Людміле Верамеюк і Валянціне Вышынскай.**

**Фота В. КАЖАМЯКІНА.**

## Будні «Світанка»

**СЕЛЬГАСАТРАД «Світанак» філфака добра знаёмы на Кругляншчыне. У мінулым годзе ён працаваў у саўгасе «Шапялевічы», а сёлета яго працоўныя будні праходзяць у калгасе «Шлях Леніна».**

**У першыя ж дні наш атрад падзяліўся на некалькі брыгад, паміж якімі разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва. Правафланговай сярод дзяўчат ідзе брыгада Ірыны Беглік, якая працуе на льне. Кожны дзень дзяўчаты навязваюць па 8—10 тысяч снапоў. Асабліва гэта добра атрымліваецца ў Зоі Добрун, Галіны Таболінай, Ларысы Чубат, Алены Трапашка і іншых.**

**Разам з брыгадай Ірыны Беглік ударна працуе і брыгада Святланы Ступінай. Вось што пра сваіх дзяўчат гаворыць сама Святлана:**

**— Усе ў маёй брыгадзе працавітыя і старанныя. За тыдзень мы звязалі больш за 35 тысяч снапоў. Я не памылюся, калі назаву добрымі працаўніцамі Таню Марчык, Алу Макаўчык, Іну Несцяровіч, Аню Грыбоўскую.**

**Дружна і натхнёна працуюць на Круглянскім льнозаводзе і нашы юнакі. Яны разгружаюць і складваюць ільнотрасту. За два тыдні разгружана больш за 600 тон даўгунцу. Заслугоўваюць пахвалы студэнты М. Карпечанка, Л. Трубач, Л. Пракопчык, А. Гарбачоў, Я. Чапко. А Сяргей Кавалёў і Уладзімір Хількевіч працуюць на бульбаўборачным камбайне. Разам з механізатарамі калгаса яны давялі дзённую выпрацоўку на камбайне «Дружба» да 60-75 тон клубняў.**

**Студэнты-філолагі не толькі старанна працуюць, але і цікава праводзяць свой вольны час. Яны рэгулярна выпускаюць «маланкі», у якіх расказваюць пра перадавікоў, маляўніча і прыгожа афармляюць сваю атрадаўскую насценную газету «Світанак», чытаюць лекцыі, праводзяць гутаркі, сустрэчы з вядомымі людзьмі Магілёўшчыны.**

**С. ЧЫГРЫН,**
**студэнт філфака.**
**Калгас «Шлях Леніна», Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці.**

## ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА

## «У СВЕТЛЫ ДЗЕНЬ І Ў ЦЁМНУЮ НОЧ...»

**У МАТЭРЫЯЛЕ, ЗМЕШЧАНЫМ У «БЕЛАРУСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ» (№ 12 (1312) АД 26 САКАВІКА 1981 ГОДА), КАРЭСПАНДЭНТ АДЗНАЧАЎ НЕДАХОПЫ, ЯКІЯ ІСНАВАЛІ Ў ІНТЭРНАЦЕ № 7 У СУВЯЗІ З НЕЭКАНОМНЫМ ВЫКАРЫСТАННЕМ ЭЛЕКТРАЭНЕРГІІ. РЭДАКЦЫЯ АТРЫМАЛА РЭАГАВАННЕ АДМІНІСТРАЦЫІ ІНТЭРНАТА:**

«Артыкул абмеркаваны на пашыраным пасяджэнні студэнцкага савета, актыву інтэрната, членаў прафбюро факультэтаў, дзе было прызнана, што выпадкі неэканомнага выкарыстання электраэнергіі сапраўды маюць месца ў нашым інтэрнаце. Вырашана правесці на ўсіх паверхах тлумачальную работу са студэнтамі, акрамя таго ўвесці ў абавязак дзяжурных, стараст паверхаў штодзённыя праверкі выкарыстання электраэнергіі ў жылых памяшканнях і месцах грамадскага карыстання».

# ПА АБАВЯЗКУ ПАМЯЦІ

**В. ШУМІЛОЎСКАЯ,**
**старшы кансультант Міністэрства юстыцыі БССР,**
**выпускніца БДУ 1946 г.**

**СПОЎНІЛАСЯ 40 ГАДОЎ З ТАГО ЧАСУ, ЯК СТУДЭНТАЎ МІНСКАГА ЮРЫДЫЧНАГА ІНСТЫТУТА РАЗЛУЧЫЛА ВАЙНА. ВЯСНОЙ 1941-га, ЗДАЎШЫ АПОШНІЯ ЭКЗАМЕНЫ ЗА ТРЭЦІ КУРС, ЯНЫ, ВЯСЁЛЫЯ І ШЧАСЛІВЫЯ, ПОЎНЫЯ НАДЗЕЙ І МАР, РАЗ'ЕХАЛІСЯ НА СВАЮ ПЕРШУЮ САМАСТОЙНУЮ ПРАКТЫКУ. АЛЕ ЎСЕ РАЗАМ БОЛЬШ НЕ СУСТРЭЛІСЯ...**

Пасля заканчэння вайны паступова адшукалі мы тых, хто застаўся жывы, і вось нядаўна адбылася наша пятая сустрэча. Яна была такая ж хвалюючая, як і тыя, папярэднія... Ідуць гады, і нашых салдат, што Айчыну ў баях адстаялі, становіцца ўсё менш. З сумам адзначылі мы, як парадзелі нашы рады. Вайна так ці інакш дае сябе адчуваць: раны не загойваюцца. На 10 чалавек стаў меншым наш «атрад» студэнтаў.

З месца збору мы накіраваліся ва універсітэт, у корпус юрыдычнага факультэта, дзе ўстаноўлена мемарыяльная дошка з імёнамі загінуўшых. Усклалі кветкі, пастаялі моўчкі. А потым, чытаючы выбітыя на ёй імёны, успаміналі жывыя аблічча загінуўшых. Асаблівае хваляванне выклікалі фатаграфіі, што змешчаны побач з мемарыяльнай дошкай. Глядзім на гэтыя маладыя твары, і ў памяці ўсплываюць іх жывыя вобразы—кожны са сваім характарам.

Вось такім ён і быў тады, у 1941-м, хударлявы, светлавалосы юнак з жывымі цёмна-карымі вачыма — Васіль Жудро. Колькі разоў мы, мінчане, хадзілі па вуліцы, названай яго імем, і не ведалі, што гэта наш Жудро, пакуль не ўбачылі яго на фатаграфіі. Успомніліся і многія іншыя. І ў душы кожнага ўзнікла пачуццё вялікай удзячнасці тым, хто стварыў усё гэта — арганізатару групы «Пошук» прафесару І. І. Гарэліку і ўсім удзельнікам гэтай групы. Можна сабе ўявіць, колькі спатрэбілася працы, часу і колькі душы было ўкладзена, пакуль на дошцы з'явілася столькі імён. Тое, што зрабілі і працягваюць рабіць гэтыя рабяты — вельмі патрэбная і важная справа. Важная не толькі для нас, таварышаў і сяброў загінуўшых, але і для будучых пакаленняў. Нельга забываць аб тым, якой цаной здабыта сённяшняе шчаслівае жыццё.

Мы ўспаміналі свае студэнцкія гады, тое, што давялося перажыць у час вайны, успаміналі тых, каго ўжо няма сярод нас.

Жорж Песнякевіч. Ён быў сціплы, не любіў гаварыць аб сабе і сваіх заслугах. І як крыўдна, што ў пачатку некаторыя з нас ставіліся да яго з недаверам і падазронасцю. Толькі значна пазней мы даведаліся, што хлопец у час вайны заставаўся ў Мінску, акупіраваным ворагам, з'яўляўся сакратаром падпольнай камсамольскай арганізацыі.

За ўспамінамі прайшла непрыкметна наша сустрэча. Хацелася яшчэ гаварыць, даведвацца аб кожным. Наш курс аказаўся самым дружным: не так лёгка сабрацца ўсім, раскіданым вайной па краіне. А мы збіраемся ўжо пяты раз і верым, што і надалей дружба наша не аслабне. І, развітваючыся з сябрамі, я падумала: не павінна наша сустрэча стаць апошняй, трэба прадоўжыць нашы ўспаміны. Гэта наш святы абавязак. І не толькі перад памяццю загінуўшых сяброў, але і перад нашчадкамі.

У гэтым годзе ЦК ВЛКСМ абвясціў аб пачатку экспедыцыі «Летапіс Вялікай Айчыннай», якая будзе праходзіць на працягу пяці гадоў. Мэта яе— сабраць як мага больш матэрыялаў аб вайне. Мы павінны дапамагчы следапытам народнага подзвігу. Наш жыццёвы, маральны вопыт абавязвае нас расказваць аб подзвігу і мужнасці людзей у час Вялікай Айчыннай вайны, аб тым, сведкай чаго ты быў сам ці іншыя, аб сабе і сваіх таварышах па зброі.

На юрыдычным факультэце ствараецца музей Айчыннай вайны, які стане скарбонкай народнай памяці аб вялікім подзвігу савецкіх людзей у час Вялікай Айчыннай, таму запісы ветэранаў і відавочцаў тых далёкіх дзён будуць вельмі каштоўным матэрыялам.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

1 кастрычніка 1981 г.
Заказ 1558. АТ 02444

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ